# ЧАРОЎНЫ СВЕТ ЗАГАДАК

***Станкевіч Анастасія, Рэспубліка Беларусь***
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт,*
*Рэспубліка Беларусь, г. Мінск*
*Навуковы кіраўнік – выкладчык Качан А.С.*

*Анатацыя.* У рабоце прадсталеўны аналіз лексічнага матэрыялу, які дазваляе выявіць значную тэматычную разнастайнасць і асаблівасці мастацкай формы беларускіх загадках.

*Ключавыя словы: беларускія народныя і літаратурныя загадкі, тэматычная разнастайнасць, вопыт народа, навакольны свет.*

Загадкі ўзніклі ў глыбокай старажытнасці, і іх найбагацейшы фонд бясконца папаўняецца. Яны карыстаюцца вялікай папулярнасцю не толькі ў дзяцей, але і дарослых, паколькі забаўляюць, развіваюць лагічнае мысленне, творчасць і ўважлівасць.

Мэта нашай работы – вывучэнне загадкі як жанру вуснай народнай творчасці.

Тэрмін «загадка», відаць, утварыўся ад слова «гадаць», што ўазначала ‘думаць, меркаваць, разважаць, раіцца’.

Загадка – іншасказальнае вобразнае апісанне якога-небудзь прадмета або з’явы на аснове падабенства паміж утоеным прадметам, які трэба адгадаць, і тым, які замяняе яго ў загадцы. Яна ж прадстаўляе сабой мудрагелістае пытанне, пераважна выражанае ў форме метафары [4, с.10].

Дадзены жанр вызначаецца трапнасцю выразаў, афарыстычнасцю і сціслацю формы. З аднаго боку, у загадках, як у прыказках і прымаўках, адлюстраваўся багаты гаспадарчы і жыццёвы вопыт народа, а з другога – у іх знайшлі выражэнне творчая фантазія, кемлівасць, дасціпны гумар, паэтычныя здольнасці [4, с.10].

Загадкі ствараюцца на аснове параўнання ў нечым падобных з’яў і прадметаў. Каб адгадаць загадку, трэба зразумець сутнасць скрытага і супаставіць яго з тым, што названа ў загадцы.

Тэматычная разнастайнасць дадзенага жанру вуснай народнай творчасці шырокая:

– стыхіі і з’явы прыроды: *Шэрае сукно цягнецца ў акно* (Хмара);

– неба, нябесныя свяцілы, зямля: *Па чорнай паляне нябачны пастух белых баранчыкаў ганяе* (Неба, вецер, хмары);

– час, поры года: *Не чуваць яго, не відаць яго, хутка ідзе, не дагоніш яго* (Час);

– гародніна, садавіна, ягады: *Стаіць дуб, пад дубам дзеці* (Бульба);

– палявыя расліны, кветкі, дрэвы: *Цвет белы, а ягадкі чорныя* (Грэчка). *Твар пахучы, хвост калючы* (Ружа);

– жывёлы, птушкі, насякомыя, рыбы: *Нос доўгі, голас тонкі, хто яго заб'е, той сваю кроў пралье* (Камар);

– чалавек, часткі яго цела: *Каля праломy белыя галубы сядзяць* (Зубы ў роце);

– хата, хатняя гаспадарка: *Старая баба ўсю зіму дзяцей грэе* (Печ);

– адзенне: *З аднаго боку – лес, з другога – поле* (Кажух);

– ежа: *Што ў вадзе родзецца і ў вадзе расходзіцца?* (Соль);

– праца, прылады працы: *Без работы я пацею і ржавею* (Сякера);

– тэхніка і культура: *Адзін мёртвы сто жывых вязе* (Карабель).

Прыходзім да вываду, што ў разнастайнай тэматыцы загадак адлюстравалася мудрасць народа, які набываў свой жыццёвы вопыт і пазнаваў свет у працэсе працоўнай дзейнасці пры непасрэдным сутыкненні з прадметамі і з'явамі навакольнага свету.

Загадкі не толькі цікавыя, займальныя, яны і мілагучныя, складныя, падобныя на кароценькія вершы. Акрамя традыцыйных, створаных шляхам апісання ўтоенага прадмета, вылучаюць яшчэ некалькі відаў загадак: загадкі-апісанні, загадкі-жарты, загадкі-пытанні, загадкі-задачы, загадкі-шарады, лагагрыфы, анаграмы, метаграмы, паліндромы, акразагадкі, амонімы.

Новыя з'явы жыцця знаходзяць сваё адлюстраванне ў сучасных загадках пра інтэрнэт, космас, электрычнасць і інш. Паводле аўтарства загадкі, як і казкі, падзяляюцца на народныя і літаратурныя. Н. Гілевіч, В. Вітка, Р. Барадулін, Е. Лось, Кандрат Крапіва, У. Карызна, В. Зуёнак, М. Пазнякоў, У. Мацвеенка і інш., ствараючы свае загадкі, заўсёды звярталіся да народнага вопыту, пераймалі яго. Пагэтаму літаратурныя і народныя загадкі часта падобныя паміж сабой. Дзякуючы таленавітым майстрам мастацкага слова, мы атрымалі ў спадчыну цэлыя кніжкі літаратурных загадак.

Аналіз лексічнага матэрыялу паказаў, што народныя загадкі, як правіла, карацейшыя, а літаратурныя даюць падрабязнае апісанне прадмета з розных бакоў. І яшчэ заўважым: літаратурныя загадкі часцей за ўсё вершаваныя. Разам з тым і народныя, і літаратурны загадкі павучальныя, яны развіваюць назіральнасць, розум, фантазію.

Нельга не адзначыць блізкасць беларускіх загадак да рускіх і ўкраінскіх. Тлумачыцца гэта цеснымі гістарычнымі, эканамічнымі і культурнымі ўзаемасувязямі трох брацкіх народаў. Вось, напрыклад, беларуская загадка пра мароз: *"Без сякеры, без кліна на рацэ мост зрабіў"*. Аналагічная загадка ёсць і ў рускім *("Без клина, без топора мост мостит")*, і ва ўкраінскім *("Без сокири, без долота, а мости будує"*) фальклоры. Значыць, многія беларускія народныя загадкі маюць агульнаславянскае паходжанне [4, с.18].

У народзе кажуць: загадка – розуму зарадка. Лічыцца, што галоўная функцыя загадкі – развіваць у чалавека мастацка-вобразнае мысленне. У мінулым загадка служыла сродкам выпрабавання разумовых здольнасцей. Толькі з цягам часу адгадванне загадак стала забавай.

У духоўнай спадчыне беларускага народа загадкам належыць значнае месца. Сёння ў беларускім фальклоры іх налічваецца каля 3500. Намі было прааналізавана каля 115 загадак, сярод якіх вылучана 70 народных і 45 літаратурных. Мы выяснілі, што народныя загадкі адгадваюцца значна хутчэй.

Мова загадак – жывая, вобразная, сакавітая, трапная, надзвычай выразная. Дзякуючы гэтым невычарпальным сродкам народнай мудрасці літаратурная мова робіцца больш гібкай, адточанай і выразнай.

У народзе кажуць: «У кнізе святло. Яно патрэбна ўсім». Думаецца, што гэтыя словы можна аднесці і да зборнікаў загадак.

Літаратура:

1. Беларускі фальклор: Хрэстаматыя./ Склад.К.П.Кабашніаў і інш. – Мінск, 1996.
2. Бурак Л.І. Сучасная беларуская мова./ Пад рэдакцыяй Л.М.Шакуна – Мінск, 1985.
3. Гучы, роднае слова!/ Укладальнікі: Ж.Н.Прыймак, М.І.Канус – Мінск, 1995.
4. Загадкі./ Склад. М.Я.Грынблат, А.І.Гурскі – Мінск, 2004.
5. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. А.Я. Баханькова – Мн.: Навука і тэхніка, 1994.